# ПАСЛЯРЭВАЛЮЦЫЙНАЕ НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЕ АДРАДЖЭННЕ БЕЛАРУСІ І БЕЛАРУСАЎ: ПАЛІТЫКА БЕЛАРУСІЗАЦЫІ І ЯЕ ВЫНІКІ

Лепеш А. В. г. Мінск, БНТУ

Пасля Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г. беларускі нацыянальна-вызваленчы рух прыклаў вялікія намаганні па ажыццяўленні ідэі стварэння беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Аснову дзяржаўнага суверэнітэту яго прадстаўнікі бачылі ў развіцці нацыянальнай свядомасці беларусаў. У выніку шматгадовай паланізацыі і русіфікацыі яе узровень знаходзіўся на нізкай адмеціне.

Ідэя нацыянальна-культурнага адраджэння набыла трывалы штуршок для рэалізацыі сярод удзельнікаў нацыянальнага руху пасля выдання бальшавікамі аднаго з першых дакументаў Савецкай улады – Дэкларацыі правоў народаў Расіі, якая была прынята Саветам народных камісараў РСФСР 2 лістапада 1917 [1]. У Дэкларацыі былі абвешчаны чатыры асноўныя прынцыпы нацыянальнай палітыкі:

1. Роўнасць і суверэннасць народаў Расіі.
2. Права народаў Расіі на вольнае самавызначэнне і стварэнне самастойнай дзяржавы.
3. Фдмена усялякіх нацыянальных і нацыянальна-рэлігійных прывілеяў і абмежаванняў.
4. Вольнае развіццё нацыянальных меншасцяў і этнаграфічных груп, што насялялі тэрыторыю Расіі.

Вынікам гэтай Дэкларацыі стала прага народаў шматнацыянальнай былой Расійскай імперыі да стварэння самастойных дзяржаў. У Беларусі таксама была спроба стварыць самастойную дзяржаву на Першым Усебеларускім з’ездзе (снежань 1917 г.), але бальшавікі, якія страчвалі кантроль над вялізнымі тэрыторыямі, вымушаны былі адмовіцца ад заяўленай пазіцыі і перайсці да прагматычнай палітыкі аднаўлення ўнітарнай дзяржавы. Рэзалюцыі Першага Усебеларускага з’езда і найперш дакумент пра неадкладнае ўтварэнне Усебеларускага Савета Рабочых, Салдацкіх і Сялянскіх дэпутатаў, які часова станавіўся на чале кіраўніцтва краем, падаліся бальшавікам як непрызнанне Савецкай улады на Беларусі, імкненне рэстаўрыраваць капіталізм. І ў ноч на 18 снежня 1917 года Першы Усебеларускі з’езд быў разагнаны; прэзідыум і асобныя дэлегаты арыштаваны.

Папулярызацыя беларускай культуры і асабліва мовы сталі неад'емнымі фактарамі працы БНР, а пасля і Беларускага нацыянальнага камісарыята (Белнацкама), які згуртаваў вакол сябе найвыдатнейшую інтэлігенцыю Беларусі і заснаваў першую савецкую газету на беларускай мове – "Дзянніца".

Традыцыі нацыянальна-адраджэнчаскага руху, рост нацыянальнай свядомасці беларусаў, ініцыятыва інтэлігенцыі дыктавалі неабходнасць выпрацоўкі дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Афіцыйны курс на ажыццяўленне беларусізацыі пачаўся ў ліпені 1924 г. Перадумовамі палітыкі беларусізацыі сталі:

– развіццё рыначных адносін на вёсцы пасяля X з'езда РКП(б) (сакавік 1921 г.) і пераход да новай эканамічнай палітыкі (свабода гандлю, грашовы падатак, арэнда і наём рабочай сілы, інвентару і г.д.);

– палітычная амністыя 1923 г. для тых беларускіх дзеячаў, якія не выступалі са зброяй у руках супраць савецкай улады;

– першае ўзбуйненне тэтыторыі БССР (сакавік 1924 г., калі БССР перадалі 16 паветаў Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў і тэрыторыя Беларусі павялічылася да 110 тыс. км², а колькасць насельніцтва - да 4,2 млн. чалавек. Да гэтага БССР уключала толькі 6 паветаў Мінскай губерні – Бабруйскі, Барысаўскі, Ігуменскі, Мазырскі, частка Мінскага і Слуцкага з тэрыторыяй у 52,3 тыс. км² і з насельніцтвам у 1,5 млн.чалавек);

– пачатак дзейнасці даследчых (Інбелкульт) і вышэйшых навучальных устаноў (БДУ, БПІ і інш.).

Беларусізацыя як дзяржаўная палітыка 1920-х гг. мела тры этапы:

1. Складванне перадумоў (1921 – пачатак 1924 гг.);
2. Рэальнае ажыццяўленне (1924 – 1928 гг.);
3. Згортванне (з 1929 г.).

15 ліпеня 1924 г. на другой сесіі ЦВК БССР была прынята пастанова "Аб практычных мерапрыемствах па правядзенні нацыцянальнай палітыкі". З гэтага часу праграма беларусізацыі набыла сілу закона.

Пад беларусізацыяй у шырокім сэнсе слова разумелася наступнае [3]:

1. Развіццё беларускай культуры: стварэнне школ, тэхнікумаў, ВНУ з беларускай мовай навучання, адкрыццё культурна-асветніцкмх установ, развіццё беларускай літаратуры, выданне на беларускай мове кніг, газет, часопісаў, разгртванне навукова-даследчай работы па ўсебаковым вывучэнні гісторыі Беларусі

Сапраўды, праблеме мовы адводзілася цэнтральнае месца ў мерапрыемствах палітыкі беларусізацыі. Афіцыйна заяўлялася, што на тэрыторыі БССР роўнаправўнымі прызнаваліся чатыры мовы – беларуская, руская, польская і яўрэйская. Улічваючы тое, што ў БССР паводле перапісу 1926 г. большасць складалі беларусы (80,6 %; яўрэі – 8,2 %; рускія – 7,7 %; палякі – 2 %; украінцы – 0,7 %, іншыя – 0,8 %), беларуская мова абвяшчалася мовай зносінаў паміж дзяржаўнымі ўстановамі, паміж дзяржаўнымі органамі БССР і СССР, а таксамі саюзным рэспублікамі мовай зносінаў прызнавалася руская мова.

У 1924-1925 гг. Наркамасветы атрымаў загад аб увядзенні беларускай мовы ў якасці абавязковай ва ўсіх школах; у ВНУ быў план заснаваць спецыяльныя кафедры па вывучэнні гісторыі развіцця Беларусі; пры прыёме ў ВНУ і тэхнікумы павінны былі патрабаваць веданне беларускай мовы. Тэрмін беларусізацыі школ прадугледжваўся ў тры гады. Сапраўды, да 1928 г. каля 80 % агульнаадукацыйных школ было пераведзена на беларускую мову навучання.

Важным накірункам моўнай палітыкі з’явілася павелічэнне колькасці газет, кніг, часопісаў на беларускай мове. За гады беларусізацыі было створана выдавецтва “Савецкая Беларусь”, пачалося выданне газеты “Савецкая Беларусь” і часопіса “Наш край”, адкрыта Беларуская дзяржаўная бібліятэка. У 1927 г. у рэспубліцы выходзілі 20 газет, з іх 10 – на беларускай мове, 3 – на яурэйскай, 3 – на рускай, 2 – на польскай, 1 – на змешанай.

1920-я гг. – зорны час для працы беларускіх літаратараў. Былі створыны літаратурна-мастацкія аб’яднанні пісьменнікаў – “Маладняк” (М. Чарот, К. Чорны, М. Лынькоў, К. Крапіва, М. Гарэцкі), “Узвышша” (Я. Колас, Я. Купала, Ц. Гартны). Выдаваліся часопісы “Маладняк”, “Полымя”, “Узвышша”.

Для падрыхтоўкі навуковых кадраў стваралася шырокая сетка курсаў беларусазнаўства. Можна канстатаваць, што час напярэдадні афіцыйнага правядзення палітыкі беларусізацыі стаў часам стварэння

навуковай платформы ў БССР. Так, у 1920 г. пачаў сваю працу Беларускі політэхнічны інстытут (БПІ), у 1921 г. быў адкрыты Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (БДУ), у 1922 г. – Інбелкульт, які ў студзені 1929 г. быў ператвораны ў Акадэмію Навук БССР. У 1919-1920 гг. назіраецца дзейнасць педагагічных інстытутаў у Мінску, Віцебску, Магілёве, Гомелі, Горы-Горацкага земляробчага інстытута. У 1924 г. адкрыўся Віцебскі ветэрынарны інстытут. Кіраўнікамі вядучых навуковых установаў былі прызначаны прадстаўнікі гістарычнай інтэлігенцыі, якія выдатна ведалі асаблівасці беларускай мовы, гісторыі, культуры. Так, першым рэктарам БДУ стаў вядомы гісторык-славіст У.І. Пічэта, першым кіраўніком БПІ – таксама гісторык Н.К. Ярашэвіч, першым прэзідэнтам АН БССР – грамадска-палітычны дзеяч, гісторык, вучоны У.М. Ігнатоўскі.

2. Вылучэнне прадстаўнікой мясцовага насельніцтва на партыйную, савецкую, прафесійную і грамадскую работу.

Гэта называлася палітыкай карэнізацыі. Ставілася задача адбіраць прадстаўнікоў карэннага насельніцтва на тую ці іншую пасаду не па нацыянальнай прыкмеце – беларус-не беларус, а па дзелавым якасцям, веданню ўмоў і асаблівасцей Беларусі, дасканаламу валоданню беларускай і рускай мовамі. Дзякуючы такому памяркоўнаму падыходу, у 1927 г. працэнтная доля беларусай і прадстаўнікоў астатніх нацыянальнасцяў у розных установах была наступная [2]:

| | Беларусы | Рускія | Яўрэі | Палякі |
|---|---|---|---|---|
| Адміністрацыйныя ўстановы | 51,3 | 18,0 | 24,8 | 0,1 |
| Гаспадарчыя установы | 30,8 | 13,1 | 49,3 | 1,1 |
| Судовыя органы | 26,3 | 21,1 | 42,1 | – |
| Зямельныя органы | 59,5 | 24,1 | 10,1 | – |

Як відаць з прыведзеных лічбаў, беларусы пераважалі ў адміністрацыйных і зямельных органах, яўрэі – у гаспадарчых і судовых, што тлумачылася традыцыйна лепшай падрыхтоўкай апошніх у галіне эканомікі і юрыспрудэнцыі. Таксама да 1927 г. павялічылася на 48 % удзельная вага мясцовага беларускага насельніцтва сярод раённых кіраўнікоў.

3. Перавод справаводства партыйнага, дзяржаўнага, прафесійнага і кааператыўнага апаратаў і часцей Чырвонай Арміі на беларускую мову. Агульны тэрмін для перавода справаводства на беларускую мову для ўсіх установў вызначаўся ў тры гады. Ужо да 1927 г. каля 80 % служачых у цэнтральных органах улады валодалі беларускай мовай. Першымі, у найкарацейшы час, за адзін год (да ліпеня 1925 г.) перайшлі на беларускую мову кіраўніцтва справамі ЦВК і СНК БССР, Наркамасветы і Наркамзем.

На жаль палітыка беларусізацыі была згорнута пачынаючы з 1929 г. Прычынамі згортвання з'явілася вяртанне да ідэалогіі сусветнай рэвалюцыі, адмова ад нэпа, уніфікацыя і цэнтралізацыя дзяржаўнага кіравання і культурнага развіцця. Тым не менш, гэтыя амаль што пяць год вяртання да сваіх каранёў дапамаглі беларусам "людзьмі звацца", смела заявіць аб сваёй самаідэнтыфікацыі і на культурным, і на палітычным узроўні.

**Выкарыстанная літаратура**

1. История Советской Конституции. Сборник документов, 1917 - 1957 гг. / Отв. ред.: Гайдуков Д.А., Коток В.Ф., Ронин С.Л. – М.: Изд-во АН СССР, 1957.

2. Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. – Мн.: ВП "Экаперспектыва", 1997.

3. Практическое разрешение национального вопроса в Белорусской Социалистической Советской Республике: по материалам Национальной комиссии ЦИК БССР: [в 2 ч.]. – Ч. 1: Белорусизация.

## БЕЛАРУСЬ – УКРАИНА: НА ПУТИ К НЕЗАВИСИМОСТИ

Литвиновская Ю. И. г. Минск, БГУИР

Первая мировая война явилась своего рода катализатором национально-освободительного движения на европейском континенте. В ходе войны и после нее на карте Европы стали появляться новые государства, которые стремились утвердиться в качестве субъектов международных отношений. Провозглашение Белорусской Народной Республики (БНР) 24 марта 1918 г. и Украинской Народной Республики (УНР) 7 ноября 1917 г. было первой попыткой двух